View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 82:31

# ВОБРАЗ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЯНІНА ЯК НОСЬБІТА ВЫСОКІХ МАРАЛЬНЫХ ЯКАСЦЕЙ І ДУХОЎНАГА БАГАЦЦЯ Ў ТВОРЧАСЦІ Э. АЖЭШКІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АНАЛІЗУ ТВОРАЎ “ДЗЮРДЗІ” І “ХАМ”)

***Святлана Агароднікава***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле “Вобраз беларускага селяніна як носьбіта высокіх маральных якасцей і духоўнага багацця ў творчасці Э. Ажэшка (на прыкладзе аналізу аповесцей “Дзюрдзі” і “Хам”) даецца кароткі агляд польскай пісьменніцы Э. Ажэшка. Вылучаюцца найбольш значныя творы яе літаратурнай дзейнасці. Даецца ўсебаковы аналіз аповесцей “Дзюрдзі” і “Хам”; засяроджваецца ўвага на вобразах галоўных герояў і вызначаецца іх роля як носьбітаў высокіх маральных якасцей беларускіх сялян.

***Ключавыя словы: творчы перыяд, буржуазна-памешчыцкае грамадства, эксплуатацыя, высокая маральнасць, нёманскія сяляне, значэнне вобразаў***

Эліза Ажэшка – выдатная польская пісьменніца, публіцыстка, грамадскі дзеяч (1841-1910) – заслужыла прызнанне і павагу сучаснікаў не толькі ў Польшчы, але і за яе межамі (у першую чаргу – у Расіі), сваім рэалістычным майстэрствам і тэматычнай разнастайнасцю сваіх кніг.

Творы Э. Ажэшка – гэта шырокая панарама грамадскага жыцця сучаснай пісьменніцы эпохі, шэраг актуальных на той час ідэй, перакананняў, сумненняў і расчараванняў. Як зазначае літаратуразнаўца І. Шматкова, “жаночая паэзія – крыніца шчырых пачуццяў і перажыванняў, люстэрка духоўнага жыцця грамадства, нават цэлага пакалення, больш за тое, яна змяшчае ўнікальны эмацыянальны вопыт” [1, с. 75].

Даследчыкі літаратуры падзяляюць творчасць Э. Ажэшка на тры перыяды, што вызначаюцца трансфармацыяй яе поглядаў на сацыяльныя працэсы. Першы перыяд, з 1866 па 1867 гг., характарызуецца татальнай крытыкай шляхецкай культуры, што дамінавала на той час у нацыянальным кантэксце. Вельмі паказальнымі ў дадзеным накірунку з’яўляюцца яе аповесці і раманы: “Апошняе каханне”, “З жыцця рэаліста”, “У правінцыі”, “У клетцы”, “Пан Граба”. У гэтых творах Э. Ажэшка стварыла сапраўдную партрэтную галерэю нікчэмных дваран, марнатраўцаў жыцця. У “Апошнім каханні” гэта камічны персанаж – Фрыча Вявюрскі, які за сорак гадоў навучыўся толькі прыгожа завязваць гальштук; у рамане “У правінцыі” гэта адзін з галоўных герояў – легкадумны Аляксандр Снапінскі, у якім не выхаваны ні здольнасць да працы, ні паняцце аб абавязках чалавека і грамадзяніна.

І усё ж, нягледзячы на іх вартасці, першыя творы пісьменніцы не вызначаліся мастацкай дасканаласцю. У іх пераважалі прамое маралізатарства, дыдактычнасць, зварот да чытача з тлумачэннем матываў паводзін і душэўнага стану герояў. Аднак з цягам часу, у другім, самым сталым перыядзе творчасці, дыдактызм Э. Ажэшка траснфармаваўся ў разумны рэалізм. Гэта звязана і з паглыбленнем сувязей з рускімі, беларускімі і ўкраінскімі пісьменнікамі, і з падзеямі, што адбыліся ў яе жыцці.

У 1869 г. Э. Ажэшка была вымушана прадаць маёнтак бацькі Мілкоўшчызна і пераехаць у Гродна.

У гэты, гродзенскі перыяд, Э. Ажэшка раней за іншых польскіх пісьменнікаў сфармулявала мэты і задачы, якія, на яе думку, стаяць перад польскай літаратурай. Увесь час свайго адасобленага жыцця пісьменніца займаецца творчай працай, пастаяннай самаадукацыяй, вывучэннем навакольнага жыцця, асветніцкай дзейнасцю. У гэты перыяд цэнтральнай тэмай яе апавяданняў сталі быт і пакуты маленькіх людзей, “людзей бедных і цёмных”, “герояў без манументаў і лаўровых вянкоў”, як пісаў сучаснік Ажэшка вядомы

Полесгу

крытык Пётр Хмялеўскі. Апавяданні “Раманова”, “Дужы Самсон” і інш. напісаны проста, з глыбокім пранікненнем у псіхалогію маленькага чалавека; яны прасякнуты спачуваннем аўтара да гэтых “бедных і цёмных” людзей.

80-ыя гады – гады пісьменніцкай сталасці Элізы Ажэшка і росквіту крытычнага рэалізму ў польскай літаратуры. Э. Ажэшка стварае раман “Над Нёманам”, які належыць да ліку лепшых рэалістычных польскіх раманаў. І хоць на працягу ўсёй творчасці пісьменніцы галоўнай тэмай было адлюстраванне жыцця добра знаёмага ёй дваранскага асяроддзя, самыя яркія, значныя, духоўна багатыя вобразы герояў яе твораў – вобразы простых людзей, працаўнікоў. У романе “Над Нёманам” – гэта, у першую чаргу, Анзельм і Ян Багатыровічы. Менавіта яны і падобныя да іх захоўваюць памяць аб паўстанні 1863 г.: аб яго героях, сваіх земляках, аб іх патрыятычных і дэмакратычных ідэалах.

Аднак сапраўдным гімнам чалавеку працы, беларускаму селяніну, яго маральнай чысціні і духоўнаму багаццю сталі вобразы галоўных герояў знакамітых сялянскіх аповесцей Э. Ажэшка “Дзюрдзі” (1885 г.) і “Хам” (1888 г.).

У цэнтры аповесці “Дзюрдзі” незвычайнае злачынства: чацвёра сялян па прозвішчы Дзюрдзі ў глухую зімовую ноч забіваюць маладую кузнечыху Пятрусю, цвёрда ўпэўненыя ў тым, што яна ведзьма. Аднак што з’яўляецца падставай для гэтай упэўненасці, упэўненасці такой моцнай, што “труженики с орошенным потом челом, по своей чистоте и величавому спокойствию равным увенчанному лаврами челу” [2, с. 129] не спыняюцца перад такім страшным злачынствам? Адказ на гэта пытанне вынікае з цяжкіх, нават жорсткіх умоў жыцця сялянства. З першых старонак аповесці Э. Ажэшка пераконвае чытача ў тым, што ў злачынстве, на самай справе, вінавата буржуазна-памешчыцкае грамадства, якое асуджае мільёны сялян на голад і выміранне. Пісьменніца добра ведала жыццё вёскі, асабліва звычаі, патрэбы сялян нёманскага краю. Цяжкая праца, жорсткая эксплуатацыя, неадукаванасць робяць іх жорсткімі, грубымі, а беднасць і цемра – лепшая глеба для забабонаў. Сірата Франка, жадаючы выйсці за багатага Клеменса, спадзяецца на ўсемагутнасць чароўнай замовы; Пётр Дзюрдзі верыць, што яго сын ачуняў пасля цяжкай хваробы дзякуючы перамозе светлых сіл над цёмнымі. Таксама беднасць і галеча прыводзяць да душэўнай чэрствасці многіх аднавяскоўцаў галоўнай гераіні аповесці - Пятрусі. У тым большае захапленне выклікае ў чытача гэты незвычайна прывабны вобраз. Бязродная  сірата, дзяўчына ўсю сваю маладосць працавала на іншых людзей. Аднак яна не азлобілася, не страціла багацця і хараства сваёй душы, высокіх маральных якасцей. Сярод вясковых дзяўчат Пятруся вылучалася не знешняй, а ўнутранай прыгажосцю. “И глаза Петруси, не косые и гадкие, как у дочки Лабуды, глаза ее засветились, чаруя так, что сильней колдовства никакая ведьма не могла бы придумать. А больше ничего необыкновенного в ней не было. Таких свежих и статных, как она, можно много найти на свете. Но глаза ее были необыкновенны своей красноречивостью, они просто говорили, притягивая к себе словно золотым шнурком. Они раскрывали всю ее душу, когда уста молчали, не умея и не смея говорить” [3, с.165].

Пятруся любіць працу, якая прыносіць ёй радасць і задавальненне, любіць песню, якая з ёй і ў радасці, і ў горы, любіць людзей, якім дапамагае чым толькі можа. Ведаючы пра лекавыя ўласцівасці многіх раслін, яна імкнецца вылечыць аднавяскоўцаў ад іх шматлікіх хвароб. І тым больш недарэчным і жудасным падаецца тое, што менавіта гэтыя веды выклікаюць страшную падазронасць людзей у чарадзействе, якая прывядзе гераіню да смерці.

Галоўныя якасці характару Пятрусі – незвычайная дабрыня і шчырасць. Яна з любоўю і клопатам даглядае старэнькую бабулю, яна гатовая любіць увесь свет у самую шчаслівую пару свайго жыцця, забыўшыся на ўсе крыўды і кпіны жыхароў Сухой Даліны.

Аднак найбольш поўна раскрываецца ўнутраны свет Пятрусі, яе здольнасць да глыбокіх і моцных пачуццяў у каханні да Міхала Кавальчука. Шэсць гадоў верна і аддана чакае яна хлопца з вайсковай службы, адмаўляе закаханаму ў яе Сцяпану Дзюрдзі (аднаму з сваіх будучых забойцаў) і пакідае праз гэты прытулак у яго стрыечнага брата, Пятра Дзюрдзі.



Полесгу

Некалькі гадоў працуе яна ў маленькім маёнтку, а калі вяртаецца Міхал Кавальчук, выходзіць за яго замуж. Здавалася б, выпрабаванні гераіні скончыліся: яна стала гаспадыняй у мужнінай хаце – мара той жа Франкі. Аднак сяляне Сухой Даліны і гэта растлумачылі варажбой, не зразумеўшы ні глыбіні кахання, ні маральнага хараства Пятрусі. “Долго после этого люди в Сухой Долине говорили, что Петруся и Ковальчука чем-то приворожила. Ну, слыхано ли это, чтобы парень, да еще уезжавший в чужие края, шесть лет помнил девушку, а уже особенно такой, которому самые богатые невесты вешались на шею… Степана приворожила и этого приворожила, только того после отпустила, а этого себе забрала. Зелье, что ли она знает такое? Или, может, еще что-нибудь похуже?..” [3, с. 166]

Так, беднасць і галеча многіх аднавяскоўцаў Пятрусі пасялілі ў іх цвёрдую веру ў забабоны, не дазволілі зразумець, як было вышэйпададзена, веліч яе душы. У такіх умовах заканамерна забойства Пятрусі – “ведзьмы”. Бо Дзюрдзі ўчынілі злачынства згодна з няпісанымі законамі сяла, што лічаць знішчэнне “ведзьмаў” справай неабходнай і нават пачэснай…

Таксама як услаўленне чалавека з народа задумана Элізай Ажэшка яе трэцяя сялянская аповесць “Хам” (першая – “”Нізіны). У першапачатковым варыянце яна павінна была называцца “Нёманскі рыбак”, але потым пісьменніца змяніла назву, каб не было асацыяцыі з раманам П’ера Лоці “Ісландскі рыбак”, які быў выдадзены ў гэты час на польскай мове. Замена аказалася ўдалай, бо назва “Хам” сваёй палемічнай завостранасцю дапамагае больш глыбока зразумець сутнасць твора.

У “Хаме” адсутнічае разнастайнасць характараў і ўсебаковасць у апісанні вясковага жыцця, як у “Нізінах” і “Дзюрдзі”. Гэта аповесць пра лёс двух людзей, пра сутыкненне двух супрацьлеглых характараў, дзвюх розных маралей, несумяшчальнасць якіх прыводзіць да трагічнай развязкі. Усю сваю ўвагу Э. Ажэшка засяродзіла на двух галоўных героях – Паўле і Франца. Некалькі другасных персанажаў – сястра Паўла, яе муж і дзевер, Аўдоцця – складаюць толькі неабходны фон для галоўных дзеючых асоб, і характарызуюцца яны адной-дзвюма рысамі, аднак, рысамі дакладнымі і правільнымі.

Герой аповесці Павел – саракагадовы беларускі селянін, “хам”, як пагардліва называла яго шляхта, лічачы істотай грубай і прымітыўнай. Але менавіта ён, сцвярджае пісьменніца, сапраўдны чалавек, здольны, як і Пятруся (“Дзюрдзі”), на глыбокае пачуццё, поўны пачуцця ўласнай годнасці, дабрыні, жыццёвай мудрасці, фізічнага і душэўнага здароўя. Павел падобны да свайго асяроддзя сваім разуменнем абавязкаў, сваяцкіх адносін і інш. Аднак ён не звычайны селянін, ён вылучаецца і ладам жыцця (жыве адасоблена, займаецца не земляробствам, а рыбалоўствам) і нават знешнім выглядам – сталасцю, маўклівасцю, за якімі людзі адчувалі яго інтэнсіўнае ўнутранае жыццё. Уся гісторыя яго трагічнага кахання ўваходзіць у супярэчлівасць з поглядамі і традыцыямі сяла. Ні яго сястра, ні яе муж, вобразы якіх служаць у аповесці ўзорам сялянскай сям’і, не ўхваляюць стаўленне Паўла да Франкі. Велічы яго ўсёдаравальнасці не можа зразумець нават старая Аўдоцця, чалавек, гатовы заўсёды дапамагчы людзям.

Значнасць і душэўная шчырасць Паўла поўнасцю раскрываюцца ў яго стаўленні да жонкі. Гэты просты селянін, “хам”, - адзіны, хто зразумеў драму Франкі, зразумеў, што не прыродная дрэнная чалавечая сутнасць, а дурное жыццё горада загубіла яе душу, што яна – ахвяра – “бедная”, як не раз кажа ён, “бедная” и “несчастная” [3, с. 331].

Франка, можна сказаць, звыклася, зраслася з лёгкім жыццём і заганамі горада, таму так трагічна безнадзейнымі з’яўляюцца ўсе намаганні мужа выратаваць яе. «Настоящая пьяница, хоть водки и не пьет…» - гаворыць пра яе Павел [3, с. 407].

І толькі бязмежная дабрыня Паўла, які аддаўшы ўсе свае грошы, выкупае яе ў ўрадніка (пасля спробы атруціць мужа), маральна знішчае гэту няшчасную жанчыну, і выратаваць яе ад пакут сумлення можа толькі смерць.

Увогуле неабходна адзначыць, што вобразы Пятрусі (“Дзюрдзі”) і Паўла Кабыцкага (“Хам”) – адны з самых псіхалагічна глыбокіх вобразаў у творчасці Э. Ажэшка.

У іх знайшлі ўвасабленне лепшыя рысы сялян: шчырасць, працалюбства, незвычайная дабрыня, багацце і святло ўнутранага свету.

У кантэксце вышэй сказанага хочацца падкрэсліць здольнасць пісьменніцы ствараць панараму дынамічных літаратурных характараў, развіццё якіх дэманструе дыяпазон чалавечых здольнасцей. Як адзначыла ў адным са сваіх артыкулаў В. Губская: “Литература как часть культуры – одна из тех составляющих, которая позволяет создавать впечатление об эволюции человека” [4, с. 18]. Гэтыя словы ў поўнай ступені можна аднесці да твораў Э. Ажэшка.


1. Шматкова, І.І. Чалавек – паэт – грамадства ў беларускай жаночай паэзіі другой паловы XX стагоддзя / І.І. Шматкова // Социальные, политические и культурные процессы на территории Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: материалы II Международной научной конференции, Пинск, 24–25 ноября 2017 г. / Полесский государственный университет. – Пинск, 2017. – С. 75–78. - URL: https://elibrary.ru/item.asp?id=30651191 (Дата обращения: 25.10.2018)
2. Элиза Ожешко. Избранное. Повести, роман. Минск: «Наука и техника», 1985. – 589 с.
3. Элиза Ожешко. Господа Помпалинские. Хам. Москва: Издательство «Правда», 1987. – 511 с.
4. Губская, О.Н. Осмысление феномена человека: от ecce homo до homo soveticus (на примере произведений максима горецкого, василя быкова и светланы алексиевич) / О.Н. Губская // Социально-апполитические и культурные процессы на территории стран Центральной и Восточной Европы в исторической переспективе. – Пинск, 2017. – С. 18-22.
5. URL: https://elibrary.ru/item.asp?id=30651180 (Дата обращения: 25.10.2018).


Полесу